Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №6, 2024-06-28



УДК 908.94(476)

**Ірына МАЦЯС**
*Дацэнт кафедры менеджмента Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук.*
*Сфера навуковых інтарэсаў: персаналіі беларускай гісторыі, палітыка беларусізацыі.*
*Аўтар выдання "Усевалад Ігнатоўскі. Палітычны дзеяч, вучоны" (у суаўт. з П.І.Брыгадзіным. Мінск, 1998), больш за 20 навуковых артыкулаў.*



# Грамадская і педагагічная дзейнасць Усевалада Ігнатоўскага на пачатку XX стагоддзя

**Ключавыя словы:** *Усевалад Ігнатоўскі, Віленская прыватная жаночая гімназія М.Вінаградавай, Мінскі настаўніцкі інстытут, краязнаўства, Інбелкульт, Беларуская акадэмія навук*



*Усевалад Ігнатоўскі — дырэктар Інстытута беларускай культуры, старшыня Таварыства гісторыкаў-марксістаў. 1926 г., г. Мінск. Крыніца: БДАКФФД.*

## 1920-я гг.: ад наркама асветы да прэзідэнта Акадэміі навук

На пасадзе наркама асветы (1921—1926 гг.) У.Ігнатоўскі займаўся арганізацыяй школьнай работы — падрыхтоўкай настаўнікаў, наладжваннем выданняў падручнікаў, увядзеннем у БССР абавязковай пачатковай адукацыі. З'яўляючыся дырэктарам Інбелкульта, а потым першым прэзідэнтам Беларускай акадэміі навук, Ігнатоўскі ствараў гісторыю нашай краіны. А з'яўляючыся навукоўцам, вывучаў яе, захоўваючы гістарычную спадчыну для нашчадкаў.

У.Ігнатоўскі — адзін з першых беларускіх гісторыкаў. Яго праца *"Кароткі нарыс гісторыі Беларусі"* выйшла ў чатырох выданнях. Асноўная яго гістарычная праца *"1863 год на Беларусі"* ўбачыла свет у 1920 г. Напісаныя жывой мовай, яго працы па гісторыі Беларусі з'яўляліся ў 1920-я гг. асноўнымі падручнікамі па беларускай гісторыі ў вышэйшых навучальных установах рэспублікі. Праўда, з пачатку 1930-х гг. яго кнігі захоўваліся ў спецсховішчах бібліятэк. І толькі праз 60 год, у 1991 г., выйшла 5-е выданне "Кароткага нарыса гісторыі Беларусі".

У 1920-я гг. У.Ігнатоўскі выступаў адным з кіраўнікоў палітыкі беларусізацыі. Нацыянальны склад рэспублікі згодна з перапісам 1926 г. быў даволі разнастайным: беларусы складалі 80,6%, яўрэі — 8,2%, рускія — 7,7%, палякі — 2,0%, украінцы — 0,7%, латышы — 0,3%, літоўцы, немцы, татары — 0,1%, іншыя — 0,2% [1, с. 38]. Нездарма Ігнатоўскі пазней зазначаў: *"Тэрмін "беларусізацыя", хаця і не зусім дасканалы, але ж разуменне яго ясна… разуменне тэрытарыяльнае"* [2, арк. 183].




*У.Ігнатоўскі. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 4-е выданне. Вільня, 1927 г. Крыніца: Нацыянальная бібліятэка Беларусі.*




*У.Ігнатоўскі. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 5-е выданне. Мінск, 1991.*



Ірына Мацяс. Грамадская і педагагічная дзейнасць Усевалада Ігнатоўскага

Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №6, 2024-06-28





*С.Некрашэвіч. 1920-я гг.*
*Крыніца: Інбелкульт: 100 гадоў з часу заснавання. Віртуальная выстава на сайце ЦНБ НАН Беларусі.*

У месцах пражывання нацменшасцяў былі створаны нацыянальныя Саветы, адкрываліся беларускія школы. Асноўны сэнс нацыянальнай палітыкі быў у развіцці беларускай культуры пры забеспячэнні правоў нацыянальных меншасцяў. Беларусізацыя ў шырокім значэнні была нацыянальнай палітыкай партыі ў цэлым, а ў больш вузкім сэнсе азначала нацыянальна-культурнае развіццё рэспублікі.

У той час праблемай апрацоўкі літаратурнай беларускай мовы, складаннем навуковай тэрміналогіі, такой неабходнай маладой беларускай навуцы, займалася Навукова-тэрміналагічная камісія. Дзейнічала камісія даволі паспяхова, але распачатае нацыянальнае адраджэнне патрабавала стварэння больш маштабнай установы. У пачатку 1922 г. у Мінску быў заснаваны Інстытут беларускай культуры як *"установа навукова-даследчая і адначасова культурна-грамадская"*. Першым старшынёй Інбелкульта стаў С.М.Некрашэвіч. Установа праводзіла планавае даследаванне мовы, літаратуры, гісторыі, прыроды, эканомікі Беларусі, а таксама аб'ядноўвала працу, якая вялася па гэтых напрамках навуковымі ўстановамі і асобнымі даследчыкамі.

У лютым 1926 г. Інбелкульт згодна з пастановай Прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР выйшаў са складу народнага камісарыята асветы і стаў самастойнай установай. Яе старшынёй зацверджаны У.М.Ігнатоўскі. Паводле дадзеных на кастрычнік 1926 г., Інбелкульт налічваў 224 чалавекі, з якіх 83 — правадзейныя члены, 74 супрацоўнікі і 67 члены-карэспандэнты. Акрамя таго, у якасці сяброў секцый Інбелкульта было прыцягнута каля 200 навуковых супрацоўнікаў, пераважна з вышэйшай школы Беларусі [3, с. 24].

У жніўні 1925 г. Ігнатоўскі ўзначаліў камісію па арганізацыі першага Беларускага навуковага кангрэса. Яго работа ішла па некалькіх напрамках — гісторыі, мастацтве, эканоміцы. На кангрэс прыехалі навукоўцы з Польшчы, Заходняй Беларусі, Чэхаславакіі, Германіі, Нідэрландаў, ЗША. Савецкая Беларусь была прадстаўлена 50 дэлегатамі. Праца кангрэса, сустрэчы ўдзельнікаў, размовы — усё гэта спрыяла ўздыму аўтарытэту Беларусі, падкрэслівала значнасць яе першых навуковых дасягненняў.

На думку Ігнатоўскага, права на культурнае адраджэнне давалася ўсім незалежна ад нацыянальнасці. *"Погляд на краязнаўства як на беларусазнаўства — памылковы. Яго трэба адкінуць, бо калі не вывучыць жыццё нацменшасцяў, дык ніколі не вывучыць свайго края"*, — адзначаў ён [4, с. 71]. У лютым 1926 г. Ігнатоўскі ўвайшоў у склад прэзідыума Першага Усебеларускага краязнаўчага з'езда. Ён добра ведаў дзейнасць краязнаўчага бюро Інбелкульта, якое займалася распрацоўкай краязнаўчых даследаванняў, дапамагала музеям, бібліятэкам, архівам. Ігнатоўскі таксама выязджаў на сустрэчы з мясцовымі краязнаўцамі, разам з Я.Коласам чытаў для іх даклады, абмяркоўваў планы краязнаўчых даследаванняў.

З пашырэннем вучэбнай справы і працы па развіцці культуры змяняліся і патрабаванні да Інбелкульта. Падрыхтоўка навукоўцаў вымагала большай сістэмнасці, уліку патрэб адпаведных галін навукі, пашырэння бібліятэчнай справы, наладжвання працы з аспірантамі. У ліпені 1926 г. СНК БССР, заслухаўшы справаздачу У.М.Ігнатоўскага аб дзейнасці Інбелкульта за 1925—1926 гг., прыняў рашэнне пачаць паступовае пераўтварэнне Інбелкульта ў Беларускую акадэмію навук.

Актыўная рэарганізацыя Інбелкульта ў вышэйшую навукова-даследчую ўстанову акадэмічнага тыпу пачалася ў 1927 г. Афіцыйнай датай заснавання Акадэміі навук лічыцца 1 студзеня 1929 г., дзень дзявятай гадавіны стварэння БССР. На самай справе пастанова аб перайменаванні Інбелкульта ў Беларускую акадэмію навук была прынята яшчэ 12 кастрычніка 1928 г. на пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)Б. Першым прэзідэнтам Акадэміі навук стаў У.М.Ігнатоўскі.

Галоўная сіла Акадэміі навук была ў яе гуманітарным сектары, дзе сярод пісьменнікаў вылучаліся Я.Купала і Я.Колас, гісторыкаў — А.М.Ясінскі. Беларускай мовай займаліся С.Некрашэвіч і Я.Лёсік, гісторыяй Беларусі — У.Ігнатоўскі, В.Ластоўскі, У.Пічэта.

Арганізатары ўстановы не імкнуліся тэрмінова ахапіць усе галоўныя галіны сучаснай навукі, а зыходзілі з магчымасцяў рэспублікі, яе рэальнага навуковага патэнцыялу. Беларусазнаўчая накіраванасць рабіла Акадэмію навук сапраўды нацыянальнай акадэміяй.


С.С.Р.Б.
Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саветаў Работніцкіх, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў С. С. Р. Беларусі.
ЧЛЕНСКІ БІЛЕТ № 31
Паказчык гэтага тав. Ігнатоўскі У. М.
выбраны 4-ым Ўсебеларускім Зьездам Саве[таў] членам Ўсебеларускага Цэнтральнага Вы[ка]наўчага Камітэту Саветаў Работніцкіх, Ся[лян]скіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў на тэрм[ін] да 5-га Зьезду Саветаў.
Старшыня Ц. В. К. Беларусі
Сэкрэтар Ц. В. К. Беларусі
Менск 1922-1923 гг.

*Членскі білет УЦВК У.Ігнатоўскага.*



Ірына Мацяс. Грамадская і педагагічная дзейнасць Усевалада Ігнатоўскага

Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №6, 2024-06-28



## *Педагагічная дзейнасць Усевалада Ігнатоўскага*

Педагагічная дзейнасць была адной з граняў таленту Ігнатоўскага. У многім дзякуючы жаданню захапіць моладзь гісторыяй сваёй краіны, даць вучням якасную інфармацыю, навучыць іх лагічна думаць, супастаўляць факты, У.Ігнатоўскі вядомы як гісторык-даследчык. Выданню яго галоўнай кнігі *"Кароткі нарыс гісторыі Беларусі"* (1926) папярэднічалі *"Кароткі нарыс гісторыі Беларусі: лекцыі, чытаныя настаўнікам пачатковых школ Меншчыны"* (1919), *"Кароткі нарыс гісторыі Беларусі: лекцыі, чытаныя на курсах беларусазнаўства"* (1921), *"Кароткі нарыс нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі: (лекцыі, чытаныя для студэнтаў Мен. пед. ун-ту ў г. Яраслаўлі ў 1917—1918 року)"* (1921).

Як выкладчык Ігнатоўскі пачаў фарміравацца ў Юр'еўскім (Тартускім) універсітэце. Пад час навучання на гістарычным аддзяленні гісторыка-філалагічнага факультэта Усевалад Макаравіч прайшоў добрую навукова-гістарычную школу. Лекцыі ў Юр'еўскім універсітэце чыталі вядомыя прафесары, з адным з якіх, прафесарам А.М.Ясінскім, Ігнатоўскі пасля працаваў у Інбелкульце, а пазней і ў Акадэміі навук.

Дыплом, атрыманы па заканчэнні ўніверсітэта, дазваляў Усеваладу Макаравічу акрамя гісторыі выкладаць і славеснасць. Таму летам 1911 г. Ігнатоўскі быў часова прыняты выкладчыкам рускай мовы і славеснасці ў Віленскую прыватную жаночую гімназію М.Вінаградавай, улетку 1912 г. прыназчаны штатным выкладчыкам гісторыі [5, арк. 18]. У час працы Ігнатоўскі ўдзельнічаў у рэдагаванні зборніка, прысвечанага 300-годдзю дынастыі Раманавых, выдадзенага ў 1913 г. па распараджэнні папячыцеля Віленскай акругі.

У жніўні 1914 г., пасля адкрыцця Мінскага настаўніцкага інстытута як цэнтра па падрыхтоўцы настаўнікаў для працы ў вучылішчах і гімназіях, Ігнатоўскі паступіў на службу выкладчыкам гісторыі і геаграфіі. Мяркуючы па архіўных звестках, У.Ігнатоўскі быў рознабакова адукаваным спецыялістам, шмат рабіў, каб яго вучні ведалі гісторыю, імкнуліся глыбей разумець жыццё свайго і іншых народаў.




*Будынак Мінскага настаўніцкага інстытута. 1914 г. Крыніца: Сайт БДПУ.*

У Нацыянальным архіве Беларусі захавалася запіска Ігнатоўскага, дзе ён адзначае, што пры выбары падручніка варта ўлічваць і падрыхтоўку студэнтаў, і неабходнасць фарміравання логікі мыслення ў студэнтаў. *"Трэба звярнуць увагу,*— пісаў Ігнатоўскі, — *на вывядзенне з фактаў следстваў, якія зноў-такі з'яўляюцца прычынамі найважнейшых падзей. З дапамогай падручніка трэба прыцягнуць увагу навучэнцаў да самастойнай працы ў вывучэнні Айчыны і параўнанні яе побыту з побытам іншых краін… Можна спыніцца на падручніках К.М.Курдава і Э.Лестгафта. Абодва падручнікі змястоўныя, асабліва падручнік Лестгафта, у якім маецца шмат геалагічнага матэрыялу. Аднак спыніцца на падручніку Лестгафта нельга, маючы на ўвазе колькасць урокаў, адведзеных на бацькаўшчыну. Акрамя таго, у ім значна менш дыяграм і картаграм, чым у падручніку К.Курдава. Апошняе меркаванне прымушае спыніцца на падручніку Курдава"* [6, арк. 16]. Відавочна, што да выкладання Усевалад Макаравіч ставіўся вельмі адказна, звяртаў увагу на тое, якой мовай напісаны падручнік, колькі інфармацыі змяшчае, ці зацікавіць ён чытача.

Ігнатоўскі ў Мінскім настаўніцкім інстытуце больш працаваў з малодшымі курсамі, клапаціўся аб выхаванцах: бываў у іх на кватэрах, цікавіўся іх побытам, тым, як яны бавяць час. У справаздачах Усевалад Макаравіч адзначаў дэталі, а гэта — сведчанне зацікаўленасці: *"…У большасці выпадкаў выхаванцы жывуць па два чалавекі ў пакоі з эканамічных меркаванняў. Пакоі звычайна вельмі невялікія: два ложкі, стол, два крэслы, часам, як прадмет раскошы, этажэрка для кніг… Выхаванцы імкнуцца, відаць, стварыць некаторую выгоду ў сваіх пакоях. На сценах часам даводзіцца сустракаць паштоўкі ці віды, ці копіі карцін Аляксандраўскага музея, Траццякоўскай галерэі, ці партрэты рускіх пісьменнікаў"* [6, арк. 87, 88].

Усевалада Макаравіча хвалявала агульная эрудзіраванасць вучняў. Каб схіліць вучняў да чытання мастацкай літаратуры, Ігнатоўскі звяртаў іх увагу на цікавыя кнігі па гісторыі, прапануючы ім творы Эберса *"Дачка егіпецкага цара"* і *"Імператар"*, *"Нявеста Ніла"* і *"Серапіс"* Плутарха; *"Жыццё знакамітых грэкаў"* Фелье, *"Сярэднявечны манастыр"* Іванова [6, арк. 67].

*"Увогуле, пасля наведвання кватэр у мяне склалася ўражанне пра выхаванцаў такое: яны больш*



Ірына Мацяс. Грамадская і педагагічная дзейнасць Усевалада Ігнатоўскага

Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №6, 2024-06-28



*дамаседы, шмат вучацца, жывуць адно з адным добра... Жывуць яны бедна, але вельмі чыста і ахайна, асабліва бедна жывуць Траскавіч і Міланавіч. Неабходна аблегчыць іх становішча. Усе выхаванцы выдатных паводзін"* — зазначыў у справаздачы У.Ігнатоўскі [6, арк. 88, 89]. Гэтая справаздача сведчыць аб добразычлівасці і неабыякавасці да студэнтаў з боку Ігнатоўскага.

Летам 1915 г. Мінскі настаўніцкі інстытут быў заняты пад шпіталь, восенню эвакуяваўся ў Яраслаўль. Гэта выбіла з каляіны працу інстытута: не ўсе вучні змаглі прыехаць у Яраслаўль, не хапала дапаможнікаў, літаратуры. Зусім не той настрой быў у вучняў і выкладчыкаў у параўнанні з Мінскам. Не вырашана было пытанне аб воінскім абавязку выхаванцаў. Не ўсім студэнтам дазвалялася адтэрміноўка. Таму частка вучняў была прызваная ў войска [7, арк. 6]. Усё гэта дэзарганізавала вучэбны працэс. На 1 студзеня 1916 г. у інстытуце было 53 выхаванцы і 11 службоўцаў, у тым ліку 6 выкладчыкаў [7, арк. 3—5].

Нягледзячы на ўсе акалічнасці, жыццё ў Яраслаўлі наладжвалася. У архіве захаваліся звесткі пра экскурсіі ў Кастраму на млын Вахрамеева, у Іпацьеўскі манастыр, у якім знаходзіцца капліца Гадуновых, у Казьма-Дзям'янаўскую царкву, у якой знаходзілася карціна В.Сярова і К.Каровіна "Хаджэнне Хрыста па водах". Перад паездкай у Кастраму гутарылі пра гісторыю горада, помнікі архітэктуры і мастацтва. У справаздачы Ігнатоўскі адзначае, што пасля наведвання Іпацьеўскага манастыра навучэнцы доўга абмяркоўвалі ўбачанае [8, арк. 118, 119].

Напярэдадні экскурсіі на млын вывучалі гісторыю мукамольнай справы ў Расіі. Пасля экскурсіі Ігнатоўскі пісаў: *"выхаванцы фізічна стомленыя, у пыле і пакуце, ажыўлена дзяліліся ўражаннямі"* [8, арк. 96, 97]. Відаць, Усевалад Макаравіч атрымліваў асалоду ад паездак, ад уражанняў выхаванцаў. Ігнатоўскага навучэнцы называлі "бацька", яго любілі і паважалі, ён меў прыкметны ўплыў на студэнцтва. Чытаць справаздачы Ігнатоўскага вельмі цікава — ніякай казёншчыны, усё апісана яскрава, жыва.

Жыццё ў Яраслаўлі было вельмі цяжкім. Шмат вучняў не мелі цёплага адзення, кватэры дрэнна атапліваліся. Усё, што мог зрабіць інстытут, гэта прапанаваць вучням гарачы чай у ходзе заняткаў. Некаторыя выхаванцы вярталіся ў Беларусь. Адны — таму, што немагчыма было пражыць на стыпендыю ў чужым горадзе, другія — таму, што дома неабходна было весці гаспадарку, бо дарослыя мужчыны ваявалі. Некаторых актыўна забіралі ў войска. Архіўныя дакументы сведчаць, што 33 навучэнцы інстытута пайшлі ў дзеючую армію. На пачатак 2017 г. у інстытуце вучылася толькі 18 чалавек [9, арк. 4]. За год, такім чынам, колькасць навучэнцаў скарацілася на 35 чалавек, але інстытут працягваў працаваць.

Люты 1917 г. многае змяніў у жыцці інстытута. Ужо ў красавіку 1917 г. упершыню зайшла размова аб вывучэнні Беларускага краю. У пратаколе пасяджэння педагагічнай рады інстытута чытаем: *"Выхаванцы інстытута выяўляюць жывую цікавасць да вывучэння роднага беларускага боку. Нажаль, у бібліятэцы інстытута маецца мала матэрыялу, неабходнага для дадзенай працы... Прасіць т. Ігнатоўскага пры паездцы ў Маскву набыць неабходныя кнігі па гісторыі Беларусі"* [10, арк. 70]. Адначасова ў праўленне Віленскай навучальнай акругі было адпраўлена прашэнне аб выдзяленні для бібліятэкі інстытута кніг і матэрыялаў, звязаных з гісторыяй Беларусі.

Летам 1917 г. Міністэрства асветы прыняло пастанову аб ускраінных інстытутах. У пастанове ішла гаворка аб неабходнасці арганізацыі ў гэтых установах вывучэння мясцовай мовы, літаратуры, гісторыі і геаграфіі. Там, дзе магчыма, прапаноўвалася праводзіць выкладанне гэтых прадметаў на роднай мове. Тады ж у Палажэнні аб асноўных прынцыпах сумеснай работы педагагічнай рады Мінскага настаўніцкага інстытута з'яўляюцца пункты аб актыўным садзейнічанні культурна-нацыянальнаму развіццю Беларусі [11, арк. 74]. Для Ігнатоўскага гэта стала пачаткам новага этапу




*На Вайсковых могілках у цэнтры Мінска ёсць магіла, паўз якую часта праходзяць тыя наведвальнікі, якія прыйшлі паглядзець на надмагіллі вядомых беларусаў: Якуба Коласа і Янкі Купалы, Кузьмы Чорнага і Паўлюка Труса. Імя ж, выбітае на гэтым помніку, вядома далёка не ўсім. На помніку чытаем: першы прэзідэнт Беларускай акадэміі навук. Тут пахаваны Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі, першы прэзідэнт Беларускай акадэміі навук, вядомы гісторык і грамадска-палітычны дзеяч Беларусі, імя якога непарыўна звязанае з гісторыяй Беларусі, з пачаткам яе культурна-нацыянальнага адраджэння ў 1920-я гг.*



Ірына Мацяс. Грамадская і педагагічная дзейнасць Усевалада Ігнатоўскага

жыцця — перадачы студэнтам ведаў па гісторыі Беларусі. Лекцыі, прачытаныя ў інстытуце, пазней будуць надрукаваныя і стануць самай прыкметнай працай Ігнатоўскага-гісторыка.

У сакавіку 1918 г. Ігнатоўскі ўзначальвае інстытут — трынаццаццю галасамі супраць аднаго яго абіраюць старшынёй савета, фактычна — дырэктарам [12, арк. 54]. На пасяджэнні вырашаецца, што да наступнага вучэбнага года неабходна перавесці інстытут у Мінскую губерню або (пры немагчымасці) у адзін з гарадоў Беларусі.

Арганізаваць пераезд у Беларусь было няпроста. Мінская губернская ўправа без дазволу акупацыйнай улады не магла дапамагчы. Урад БНР, абвешчаны 9 сакавіка 1918 г. ва ўмовах нямецкай акупацыі, — таксама. У гэтых абставінах савет інстытута прыняў рашэнне ісці на перагаворы з нямецкай уладаю [12, арк. 93]. Даручылі гэтую справу У.М.Ігнатоўскаму.

Восенню 1918 г., пасля дазволу камандавання 10-й нямецкай арміі на рээвакуацыю, інстытут вяртаецца ў Мінск, дзе адразу пачынаецца працэс пераўтварэння інстытута ў вышэйшую навучальную ўстанову — Педагагічны інстытут. Для чытання лекцый у інстытут запрашаюць акадэміка Я.Ф.Карскага, прафесара У.Л.Іваноўскага, іншых лектараў з Масквы і Пецярбурга.

Пасля ўваходу Чырвонай арміі ў Мінск і стварэння БССР пытанню народнай адукацыі стала ўдзяляцца больш увагі. Адкрываліся новыя пачатковыя школы, арганізоўваліся педагагічныя курсы. Вясной 1918 г. у Мінску адкрыліся курсы беларусазнаўства для настаўнікаў Міншчыны. Працаваў на іх і У.М.Ігнатоўскі. Шмат пазней, у снежні 1920 г., з дапамогай А.Чарвякова, З.Жылуновіча і У.М.Ігнатоўскага ў Мінску пачалі дзейнічаць лектарска-інструктарскія курсы і настаўніцкія курсы. Вельмі хутка ў Педагагічным інстытуце стварылі камісію па арганізацыі Беларускага ўніверсітэта. Улетку 1921 г. было прызначана праўленне БДУ, у склад якога ўвайшоў і будучы першы рэктар Уладзімір Іванавіч Пічэта, і Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі.

Увосень універсітэт пачаў сваю працу. *"На працягу ўсёй гісторыі Беларусі Беларускі ўніверсітэт — першы ўніверсітэт, які абслугоўвае мясцовыя інтарэсы і патрэбы... Усе навукі будуць праходзіць у плоскасці беларускіх культурных запытаў і вывучэння асаблівасцяў нашага краю"*, — пісаў тады Ігнатоўскі [2, арк. 183].

БДУ адразу стаў цэнтрам развіцця беларускай асветы, навукі і культуры. Тут чыталі лекцыі знакамітыя прафесары В.Салаўёў і В.Дзякаў з Масквы, ганаровы член парыжскай Акадэміі навук А.Ясінскі. Я.Карскі таксама быў "дараваны" і запрошаны ва ўніверсітэт. Дзеля нацыянальна-культурнай працы ў Беларусь вярнулася каля 300 беларусаў, палякаў, яўрэяў. Беларускія навукоўцы, якія з'ехалі пасля рэвалюцыі ў Заходнюю Украіну і Германію, рыхтавалі падручнікі для друку ў дзяржвыдавецтве Беларусі.

У кожнага вучонага ёсць галоўная тэма даследавання. Такой тэмай для Ігнатоўскага стала гісторыя Беларусі, гісторыя яе народа. Прапаганда беларускай мовы і гісторыі — асноўная справа жыцця Усевалада Ігнатоўскага. Гады выкладання ў гімназіі і інстытуце паўплывалі на яго стыль падачы інфармацыі — структураваны, прыцягальны, заснаваны на фактах, даступны.



*У.Пічэта. 1920-я гг.*
*Крыніца: Лічбавы архіў БДУ.*
*https://earchives.bsu.by/handle/link/2264.*



*А.Чарвякоў. 1920 г.*


1. Король А. С. Белорусизация: 20—30 гг. // Страницы истории компартии Белоруссии: суждения, аргументы, факты. Минск : Университетское, 1990. С. 138.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1251.
3. Інстытут Беларускай Культуры. Гісторыя ўзнікнення, сучасная структура, навукова-даследчая дзейнасць. — Мінск, 1926.
4. Праца Першага Усебеларускага краязнаўчага з'езда (7—11 лютага 1926 г.). — Мінск, 1926. — 83с.
5. Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. — Ф. 567. Воп. 14. Спр. 1624.
6. НАРБ. — Ф. 478. Воп. 1. Спр. 4.
7. НАРБ. — Ф. 478. Воп. 1. Спр. 35.
8. НАРБ. — Ф. 478. Воп. 1. Спр. 50.
9. НАРБ. — Ф. 478. Воп. 1. Спр. 68.
10. НА РБ. — Ф. 478. Воп. 1. Спр. 82.
11. НАРБ. — Ф. 478. Воп. 1. Спр. 49.
12. НАРБ. — Ф. 478. Воп. 1. Спр. 84.


*Паступіў у рэдакцыю 28.05.2024.*